**УДК 821.161.3.09“18”(045)**

# ПОСТАЦЬ ЕВЫ ФЯЛІНСКАЙ У ЛІТАРАТУРЫ БЕЛАРУСІ XIX СТАГОДДЗЯ

**І.А. Бурдзялёва**
Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт,
вуліца Захарава, 21, 20034, Мінск, Рэспубліка Беларусь
irlita@yandex.ru

**Аннотация.** В статье рассматривается творческая индивидуальность Евы Фелинской, участницы патриотического движения, писательницы и мемуаристки. Анализируются проблемно-тематические особенности ее произведений, отражающих изменения разных сфер жизни Беларуси-Литвы вначале XIX века в результате смены культурно-исторической парадигмы. Исследуется гендерный аспект мемуаров, особенности отражения в них этапов становления личности писательницы.

***Ключевые слова***: бытовой роман, мемуарная проза, смена эпох, женский дискурс, культура повседневности.

# EVA FYALINSKAYA’S PERSONALITY IN THE BELARUSIAN LITERATURE OF THE 19$^{TH}$ CENTURY

**I.A. Burdzialeva**
Minsk State Linguistic University,
21 Zakharava str., 20034, Minsk, Republic of Belarus

**Annotation**. The article examines the creative personality of Eva Felinskaya, a participant in the patriotic movement, writer and memoirist. The author of the article analyzes the problematic and thematic features of her works, that reflect the changes in different spheres of life in Belarus-Lithuania at the beginning of the 19th century as a result of the modification in the cultural and historical paradigm. The gender aspect of the memoirs, depicted phases of Fialinskaya’s personality formation are examined there as well.

***Keywords*****:** novel of everyday life, memoir prose, change of eras, woman discourse, culture of everyday life.

У літаратурным жыцці Беларусі XIX стагоддзя адметнае месца займае постаць Евы Фялінскай, удзельніцы вызваленчага руху, чалавека з актыўнай жыццёвай пазіцыяй, празаіка і мемуарысткі. Жыццёвы шлях Евы Фялінскай (1793-1859) выразна адрозніваўся ад традыцыйнага жаночага лёсу. Ёй давялося зведаць ранняе сіроцтва і нястачу. Потым на дапамогу збяднелай

сям'і прыйшоў сваяк Станіслаў Вяндорф, які ўзяў дзяўчынку на выхаванне ў свой заможны маёнтак на Случчыне. Поўнымі нялёгкіх клопатаў былі для Евы і гады замужаства з Герардам Фялінскім, праведзеныя ў яго радавым фальварку Ваютын на Валыні. У 1833 годзе яна аўдавела, і ўвесь клопат пра шасцярых дзяцей (старэйшай дачцэ было толькі 12 год) і спаралізаваную старэнькую маці лёг на яе плечы. Патрэбы выхавання дзяцей прымусілі Фялінскую здаць у арэнду маёнтак мужа і перабрацца ў Крэмянец, дзе яна далучаецца да падпольнай патрыятычнай арганізацыі Шымана Канарскага і стварае яе філіял "Жаночае таварыства". У 1839 годзе яна была арыштавана і выслана спачатку ў невялікі сібірскі горад Бярозаў, потым у Саратаў. Толькі ў 1844 годзе Фялінскай дазволілі вярнуцца на радзіму. Яна стала жыла на Валыні, вяла гаспадарку, вырашала сямейныя справы і менавіта тады сур'ёзна занялася літаратурнай творчасцю.

Постаць Евы Фялінскай выклікала ў сучаснікаў нязменную павагу сілай духу, жыццёвай трываласцю, загартаваным характарам і высокай грамадзянскай свядомасцю. У дадатак яна мела выключную назіральнасць, здольнасць да абагульненняў, а творчыя задаткі вымагалі мастацкага асэнсавання і адлюстравання пабачанага і пережытага. Свой шлях у літаратуры Фялінская распачала дастаткова позна, маючы за плячыма амаль 50 год. Пасля публікацыі раманаў (("Герсылія" (1849), "Пан дэпутат" (1852), "Пляменніца і цётка" (1853)), у якіх яна падала рэтраспектыўны паказ жыцця беларускай правінцыі ў часы сваёй маладосці, пісьменніца звярнулася да мемуараў. Багатыя ўражанні ад побыту ў ссылцы яна пераказала ва "Успамінах, напісаных пад час падарожжа ў Сібір і жыцця ў Бярозаве і Саратаве". Маштабны мемуарны твор "Успаміны з жыцця" стаўся годным завяршэннем яе творчага шляху. У 5 тамах пісьменніца аднаўляе сваю памяць ад ранняга дзяцінства да 1821 года. Працу над гэтым выданнем перарвала смерць аўтаркі 20 снежня 1859 года.

Паміж раманамі Е. Фялінскай і яе мемуарамі існуе цесная ідэйна-тэматычная сувязь. Яны паяднаны адной мэтай: імкненнем даць "вобраз праўдзівага жыцця" беларускага грамадства на пачатку XIX стагоддзя. Гэта быў час глыбінных трансфармацый ва ўсіх сферах жыцця Літвы-Беларусі, калі ў выніку змены культурна-гістарычнай парадыгмы адбывалася развітанне краіны з традыцыйным ладам і яе ўваходжанне ў агульнаеўрапейскае рэчышча. У прадмове да "Успамінаў з жыцця" Фялінская акрэслівае сваю асноўную задачу: "Пражыўшы 60 гадоў, далучыўшыся да розных грамадскіх слаёў, жывучы ў эпоху дзіўных і няпростых перамен не толькі ў нашым краі, але і ў іншых, на свае вочы бачыла, як наша грамадства, падлеглае моцным знешнім і ўнутраным уплывам, раптоўна пераўтварылася, адкідаючы даўняе аблічча і набываючы новае. Можа я здолею затрымаць

сваімі ўспамінамі некалькі малюнкаў, якія цалкам зніклі з нашай зямлі, але з’яўляюцца тым звяном, што лучыць мінуласць з цяперашнасцю…” [1, с. 6–7]. Трохі далей Фялінская адзначае, што яе маладосць была сведкам вялікіх перамен у свядомасці, звычаях, ладзе жыцця, у грамадскіх і міжчалавечых стасунках: “Як быццам мы бачылі дзве розныя цывілізацыі, якія выраслі з рознага кораня, або былі падзеленыя мноствам стагоддзяў і сфарміраваны цалкам адрознымі акалічнасцямі” [1, с. 7]. Гэту пераменную эпоху, адзначаную розніцай культурных патэнцыялаў, дынамікай і зменлівасцю ўсіх форм жыцця, Ева Фялінская паказвае і ў бытавых раманах, і ў мемуарах.

Падзеі ў раманах, з якіх пачаўся творчы шлях Е. Фялінскай, адбываюцца ў глыбокай правінцыі, куды пачынаюць пранікаць уплывы новай, “еўрапейскай” цывілізацыі і канфліктаваць з “старапольскім” шляхецкім традыцыяналізмам. Уплыў новай цывілізацыі прыводзіць да дэградацыі маральнага стану грамадства, эканамічнага калапсу магнацкіх і шляхецкіх гаспадарак. Яна паказвае, як распадаецца былая грамадская салідарнасць, якую стваралі і ўмацоўвалі магнацкія двары. Змена палітычнай і культурнай парадыгмы выклікала рост індывідуалізму, пранікненне чужой культуры і іншаземных парадкаў у магнацкія колы, якія забыліся на сваё прызначэнне. “Са зменай акалічнасцяў сам сабой распаўся ланцуг, які лучыў багатых з бяднейшымі… Кожны пачаў жыць сам па сабе”, – працягвае Фялінская [2, с. 17]. Гледзячы на магнатаў, і шляхта пачала гнацца за выгодамі, клапаціцца пра еўрапейскі полер, патанаючы ў марнатраўстве. Пісьменніца дакарае слаі грамадства ў адступленні ад уласцівых ім абавязкаў: яна гаворыць пра магнатаў, якія імітуюць заходніх арыстакратаў, пра шляхту, хворую на панскасць, пра нуварышаў, што ўціскаюцца ў вышэйшыя класы. Гэта тыя адмоўныя тыпы, якія з’явіліся на свет у выніку новых зрухаў ў грамадстве, як сведчанне поўнага яго разладу.

Творчая манера Фялінскай фарміравалася на пераломе светапоглядных сістэм, на сутыкненні мастацкіх традыцый, што абумовіла ідэйна-мастацкі сінкрэтызм яе бытавых раманаў. Новыя рэалістычныя тэндэнцыі, што развіваліся ў заходнееўрапейскай і ў пэўнай ступені ў польскамоўнай літаратуры, прыходзілі ў сутыкненне з інэрцыяй літаратурнай традыцыі, якая бачыла ў сакралізацыі патрыярхальна-старасвецкага магчымасць захавання нацыянальнай адметнасці. Ева Фялінская імкнецца да “капіявання рэчаіснасці” і сапраўды стварае праўдзівыя замалёўкі шляхецкага быту, дае агляд тых сацыякультурных працэсаў, сведкай якіх яна была, але разам з тым маралізатарства і выразна праяўлены суб’ектывізм прыводзяць да тэндэнцыйнасці ў паказе недалёкага мінулага. Можа, менавіта таму яе проза не атрымала асаблівай чытацкай сімпатыі, што прымусіла Фялінскую шукаць іншую літаратурную форму для мастацкай споведзі – дзённікі і ўспаміны.

Менавіта мемуарныя творы сталіся вяршыняй творчасці Е. Фялінскай, прынеслі ёй папулярнасць і зрабілі адной з найбуйнейшых мемуарыстаў XIX стагоддзя

Адметнасць “Успамінам з жыцця” Е. Фялінскай надае гендарны аспект твора, які абумовіў увагу да матэрыялу, на якім звычайна не засяроджваюцца мужчыны-мемуарысты. У адрозненне ад іх аўтарка свабодна звяртаецца да адлюстравання сямейна-бытавога жыцця, стасункаў сяброўскіх ці суседскіх, паказвае змены ў гэтых, бадай, самых кансерватыўных і традыцыяналісцкіх сферах. Яе мемуары высвечваюць мінулае з такога боку, які найчасцей не ўваходзіць у склад афіцыйнай гісторыі, асвятляюць найперш з’явы прыватныя, партыкулярныя, якія ніяк не падпадаюць да катэгорыі гістарычна вызначальных. Расійская даследчыца Н. Пушкарова выказала слушныя заўвагі, што менавіта жаночыя мемуарныя тэксты XIX стагоддзя, прама ці ўскосна, падштурхнулі літаратуру да пераасэнсавання грамадскіх каштоўнасцяў і арыенціраў у бок прыватнай сферы жыцця чалавека, на што ў поўнай меры адважылася толькі наступнае, XX стагоддзе [3, с. 69].

Памяць Фялінскай зафіксавала апошнія праявы патрыярхальнага жыцця. Даўжэй за астатніх старых звычаяў трымаўся сярэдні слой шляхты, да якога належала сям’я дзядзькі Станіслава Вяндорфа, у доме якога Фялінская выхоўвалася з 7 год да самага замужаства. Дзядзька свядома не пераймаў чужаземных павеваў і сваю гаспадару ў Галынцы і прылеглых вёсках вёў па-ранейшаму. Здавалася, ён не праяўляў асаблівай актыўнасці, большую частку дня моўчкі седзячы ў гасцінным пакоі, але ўся гаспадарчая махіна, раз і назаўсёды запушчаная на пэўны лад, трымалася дысцыплінай, пачцівасцю і працавала бесперабойна. Фялінская і дагэтуль дзівіцца дабрабытам Галынкі. Фальварак функцыянаваў як натуральная самадастатковая гаспадарка, у якой нічога не прадавалася, а даход ішоў выключна на ўтрыманне дому. Цукар, канфіцюры, каву і віно, купленыя за жывыя грошы, падавалі толькі ў рэдкіх выпадках асаблівым гасцям. Але ўсё, што мелі самі, ужывалі ў вялікім мностве – хапала і гаспадарам, і збяднелым сваякам, і шматлікім рэзідэнтам, а рэшту, каб не псавалася, раздавалі па вёсках. Пісьменніца параўноўвае гаспадарку Галынкі з бяздоннай бочкай, у якой ніхто не бачыў пустога дна. Куды ж падзелася былое багацце і дабрабыт потым? “Здавалася, што раней ламалі галаву як бы найбольш спажыць дароў божых. Як іх найбольш заашчадзіць стала клопатам пазнейшых гаспадароў,” – піша аўтарка [1, с. 236].

Формы бытавога жыцця мяняліся літаральна на вачах. Успамінаючы святочныя застоллі ў дзядзькавай сям’і, Фялінская параўноўвае іх з велікодным сталом, які ладзіла праз дзесятак гадоў адна з дачок Вяндорфа. Жыццё набыло за гэты час больш далікатныя і мяккія рысы. Калі раней

клапаціліся пра колькасць і разнастайнасць ежы, сярод якіх, праўда, не было экзатычных далікатэсаў кшталту страсбургскага паштэту, то цяпер акцэнт змяніўся: стол быў густоўна ўбраны, елі з замежнай парцэляны, ды і самі стравы сталі больш адмысловымі, але тым не менш не было ўражання ранейшага дабрабыту і шчодрасці. Як пераканаўча даводзіць Фялінская, эканамічныя праблемы ўзніклі ў выніку сляпога пераймання чужой цывілізацыі, у тым, што гаспадарку пачалі весці без уліку асаблівасцей мясцовасці і клімату, назапашанага ўласнага вопыту.

Фялінская падае пластычныя малюнкі побытавага жыцця беларускай правінцыі, ставарае галерэю разнастайных шляхецкіх тыпаў ад “кунтушовай” шляхты да моладзі, якая кіравалася заходнееўрапейскімі ўзорамі. Падкрэсліваючы зменлівы характар свайго часу, яна піша, што нават у абліччы і ў фізіяноміі паміж дзядамі і ўнукамі выявілася такая вялікая розніца, “як быццам чужое племя прыйшло на нашу зямлю і тут засялілася”. Зніклі маляўнічыя постаці, мужныя і моцныя, нібы народжаныя да слуцкага пояса, жупана і шаблі. “Сёння толькі на партрэтах можна ўбачыць ранейшыя твары, але памяць мая досыць затрымала іх з натуры.” [4, с. 236].

Жаночыя мемуары ў сілу сваёй інтравертнасці пазбягаюць закранаць тэмы высокай палітыкі, але затое звяртаюцца да праблем быццам і маргінальных, але тым не менш жыццёва важных і агульназразумелых. Фялінская гаворыць пра перамены, якія адбыліся ў жаночай модзе, і гэты аспект побытавага жыцця не менш доказна, чым гаворка пра гаспадарча-эканамічныя ці палітычныя працэсы, ілюструе прынцыпова новыя змены.

Фялінская трапна характарызуе свой час, называючы яго эпохай не толькі дэзарганізацыі, але і ферментацыі, не толькі разбурэння , але і пошуку новых форм. Створаная стагоддзямі старая цывілізацыя імкліва распадалася, а новыя традыцыі яшчэ не паспелі прыжыцца і набыць акрэсленай формы, таму малюнкі энтрапіі і дэструкцыі ў творы Фялінскай пераважаюць, таму пісьменніца ўспрымае чужаземныя з’явы адназначна негатыўна. Апрача таго, патрыятычныя погляды аўтаркі безумоўна спрыялі ідэалізаванаму ўспрыняццю ўсяго старасвецкага, бо яно было для яе сінонімам нацыянальнага.

Мемуары Е. Фялінскай вылучаюцца сваёй мастацкай значнасцю, літаратурнай дасканаласцю і глыбінёй эмацыянальна-псіхалагічнага раскрыцця асобы. Для пісьменніцы стварэнне мемуараў найперш ёсць актам самарэканструкцыі і самаспасціжэння. Увага да ўнутранага стану, трапнасць і дэталёвасць псіхалагічнага малюнка, маналогі-роздумы і шматлікія дыялогі, настраёвыя малюнкі прыроды, успрынятыя чулай душой аўтаркі, белетрызаваныя жыццёвыя гісторыі збліжаюць мемуары Фялінскай з раманам, але пры гэтым яны не атаясамліваюцца з ім, захоўваючы жанравыя

рысы аўтабіяграфічнай літаратуры. На сувязь мемуарыстыкі і псіхалагічнай прозы ў свой час звяртала ўвагу Л. Гінзбург [5, с. 12].

Мемуарная проза Е. Фялінскай па мастацкаму ўзроўню нашмат пераўзыходзяць яе белетрыстыку, якая часам заснавана на надуманых схемах, – ілюстрацыях аўтарскіх канцэпцый. У мемуарах аўтарка ў першую чаргу абапіраецца не на літаратурныя штампы, а на рэальную жыццёвую аснову і ўласны досвед, а з другога боку, мемуарная літаратура, не скаваная строгімі жанравымі патрабаваннямі, давала аўтарам большую свабоду для творчага самавыяўлення. Некаторыя важныя моманты ці этапы ў жыцці Е. Фялінскай, на якіх яна асабліва канцэнтруе ўвагу (напрыклад: яна – самотная дзяўчынка-сірата ў чужым доме, або яна – маладая паненка ў складанай сітуацыі сардэчнага выбару паміж некалькімі прэтэндэнтамі на яе руку, ці яна – няшчасная маці, якая хавае адно за адным сваіх дзяцей), у мемуарах адноўлены з такой эмацыянальнай насычанасцю і псіхалагічнай дакладнасцю, якая рэдка сустракаецца ў тагачаснай мастацкай літаратуры. Знаходжанне мемуараў на перыферыі мастацкай прозы, памежны характар жанру, давалі прастору для мастацкіх эксперыментаў. На думку Л. Я. Гараніна, неафіцыйнае становішча мемуарных твораў мела свае перавагі: “У галіне зместу і ў галіне формы яно адкрывае шырокія магчымасці для наватарскіх увасабленняў” [6, с. 51].

“Успаміны з майго жыцця” – твор поліфанічны, са складанай кампазіцыйнай будовай. Займальнасць, драматычную напружанасць яму надае сама інтрыга жыцця аўтаркі, якая паўстае ў мемуарным тэксце як біяграфічная асоба, як аўтар-апавядальнік і як галоўны герой твора. Пісьменніца ўдала ўплятае факты ўласнай біяграфіі ў шматкаляровае і стракатае палатно тагачаснага жыцця, куды яна ўключае шматлікія навелістычныя эпізоды, гістарычныя анекдоты, паказкі, якія служаць ілюстратыўным матэрыялам для пацвярджэння аўтарскіх думак і назіранняў. Значнае месца ў тэксце займаюць аўтарскія заўвагі, каментарыі, разважанні, многія з якіх носяць адкрыта дыдактычны характар, што часам шкодзіць успрыманню твора. Але гэтыя разважанні прэзентуюць не толькі светапогляд мемуарысткі, але і пэўным чынам характарызуюць духоўную і інтэлектуальную атмасферу эпохі.

Аўтарскія каментары, якія ўстаўляюцца ў плынь жыцця “Я”-гераіні Е. Фялінскай, зроблены пісьменніцай з вышыні пражытага жыцця і падкрэсліваюць рэтраспектыўны характар мемуараў, перапляценне ў іх сінхранічнага і дыяхранічнага аспектаў. Натуральна, аўтарскія ацэнкі і меркаванні адкарэкціраваны часам, жыццёвым вопытам, а лірычныя ўспаміны афарбаваны настальгічным пачуццём і тугой па часах маладосці. Нягледзячы на шматслойнасць сюжэтна-кампазіцыйнай структуры,

выкарыстанне розных нарацыйных прыёмаў, мемуары Е. Фялінскай вылучаюцца цэласнасцю і спарадкаванасцю, бо арганізуючым стрыжнем з’яўляецца рух памяці аўтаркі, скіраваны на храналагічную плынь уласнага жыцця.

Мемуары Евы Фялінскай прапанавалі значныя мастацкія адкрыцці. Апрача характэрнага для жаночай мемуарыстыкі набліжэння да сферы прыватна-асабістага жыцця, майстэрства перадачы жыццёвай канкрэтыкі, у яе мемуарных творах назіраецца арыентацыя ў першую чаргу на гісторыю інтэлектуальна-духоўнага станаўлення асобы, вопыт самааналізу, дакладнасць эмацыянальна-псіхалагічнага малюнка, што было прадуктыўным для далейшага літаратурнага развіцця і, у прыватнасці, станаўлення рэалізму як мастацкага стылю.

**Бібліяграічныя спасылкі:**


1. Felińska, E. Pamiętniki z życia / E. Felińska. – Wilno, 1856. – Seria 1. – T. 1. – 467 s.
2. Felińska, E. Pamiętniki z życia / E. Felińska. – Wilno, 1856. – Seria 1. -- T. 2. – 467 s.
3. Пушкарева, Н. Л. У истоков женской автобиографии в России / Н. Л. Пушкарёва // Филологические науки. – М., 2000. – № 3. – С. 62–70.
4. Felińska, E. Pamiętniki z życia / E. Felińska. – Wilno, 1856. – Seria 1. -- T. 3. – 443s.
5. Гинзбург, Л. Я. О психологической прозе / Л. Я. Гинзбург. – Л.: Худож. лит. Ленингр. отд-ние, 1977. – 443 с.
6. Гаранин, Л. Я. Мемуарный жанр советской литературы : историко-теорет.очерк / Л. Я. Гаранин. – Минск : Наука и техника, 1986. – 223 с.